# *СУСТРЭЧА 9*

# *ДОСВЕД ЛЮБОВІ Ў ШТОДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ*

«…хрысціянская сям’я застанецца домам Бога сярод людзей. А так як Бог жыве там, то гэта месца Яго дзеяння, там Ён робіць тыя цуды, тыя вялікія рэчы, аб якіх вучыць Святое Пісанне. Жыццё хрысціянскага сужэнства – гэта «святая гісторыя», бо гэта гісторыя, якую стварае сам Бог».

а. Анры Кафарэль

**1. Уводзіны**

Малітва нашай супольнасці суправаджае нас ад першай сустрэчы. Найбольш распаўсюджаная супольная малітва – гэта малітва ў сям’і. Асабліва, калі дзеці малыя, бацькі часта разам з дзецьмі становяцца на малітву. Пасля ў многіх сем’ях гэты звычай па розных прычынах занядбоўваецца. Можна зразумець неахвоту дзяцей у падлеткавым узросце маліцца супольна, але гэта не значыць, што сужэнцы павінны адмаўляцца ад супольнай малітвы. У гэты момант яна асабліва патрэбная ў інтэнцыі дзяцей. Хрыстос пераконвае нас, што там «дзе двое ці трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх». Сужэнская і сямейная малітва асвятляе штодзённае жыццё.

**2. Сустрэча суполкі**

## *I ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

Мы спадзяёмся, што паміж сужэнствамі, якія прымаюць удзел у пілатажы, ужо зарадзілася сяброўства. І вы з радасцю чакаеце моманту, калі даведаецеся, што новага ў іх адбылося. Мы яшчэ раз просім вас аб паважнай падрыхтоўцы да дзялення жыццём.

Пазначце па пунктах тое, аб чым вы будзеце гаварыць. Мы хочам таксама прыгадаць аб захаванні дыскрэцыі. Уважліва слухайце тое, аб чым гавораць іншыя сужэнствы. Магчыма, вы пачуеце тое, што мабілізуе вас для аказання ім дапамогі. Магчыма, перажыванні іншых адкрыюць вашыя вочы на дары, якія таксама ёсць і ў вашым жыцці, а якіх вы раней не бачылі.

## *II ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Малітва супольнасці***

Будаванне нашага супольнага сужэнскага жыцця на скале, на Богу, гэта ўзаемная дапамога адно аднаму: жонка – мужу, муж – жонцы, у выкананні Божай волі ў кожным моманце штодзённасці.

**Добрая ці кепская будова (Мц 7, 21-27)**

«Не кожны, хто кажа Мне: «Пане, Пане», увойдзе ў Нябеснае Валадарства, але той, хто выконвае волю Айца Майго, які ў нябёсах. Многія скажуць Мне ў той дзень: «Пане, Пане, ці не ад Твайго імя мы прарочылі, і ці не Тваім імем выганялі злых духаў, і ці не Тваім імем многія цуды чынілі?» І тады скажу ім: «Я ніколі не ведаў вас, адыдзіце ад Мяне вы, што чыніце беззаконне».

Таму кожны, хто слухае гэтыя словы Мае і выконвае іх, будзе падобны да чалавека разумнага, які пабудаваў свой дом на скале. Пайшоў дождж, разліліся рэкі, падзьмулі вятры і ўдарылі ў дом той, а ён не ўпаў, бо пастаўлены быў на скале.

Кожны, хто слухае гэтыя словы Мае і не выконвае іх, будзе падобны да неразумнага чалавека, які пабудаваў свой дом на пяску. Пайшоў дождж, разліліся рэкі, падзьмулі вятры і ўдарылі ў дом той; і ён упаў, і падзенне яго было вялікае».

---

Малітва суполкі – гэта малітва супольнасці, якая складаецца з сужэнстваў і святара. У спантаннай малітве мы давяраем Богу тое, што мы носім у сэрцы, але адначасова мы дзелімся таямніцамі нашага сэрца з усімі, хто моліцца з намі. Малітва – гэта крыніца праўдзівага, глыбокага сяброўства.

**Псальм 16**

*Благаслаўлю Пана, які даў мне розум, **
*бо і ноччу вучыць мяне маё сэрца.*

*Пан заўсёды перад маімі вачыма, **
*бо Ён праваруч мяне, я не пахіснуся.*

*Таму радуецца маё сэрца і весяліцца душа, **
*і цела маё будзе спачываць бяспечна.*

## *ІІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

*<u>Дзяленне рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку</u>*

Пачнём гэтую частку сустрэчы дзяленнем нашым духоўным ростам, якога мы дасягнулі дзякуючы прынятым высілкам:

- абавязку «Сядзем разам»;
- слуханню Божага Слова;
- асабістай малітве;
- правілу жыцця.

Дзяленне духоўным ростам, які з’яўляецца плёнам рэалізацыі пунктаў высілку, не павінна быць справаздачай. Менавіта ў гэтай частцы сустрэчы мы можам і павінны адкрыць сваё сэрца перад іншымі сужэнствамі, каб засведчыць аб вялікіх рэчах, якія Бог чыніць у нашым жыцці. Не бачыце іх?

Калі вы не бачыце іх, то спачатку ўважліва прааналізуйце папярэдні час і запытайцеся ў сябе – ці прыкладалі вы намаганні, каб ісці да Бога? Калі так, то немагчыма, каб Ён не ахвяраваў вам Сваіх дароў. Ён ніколі ў іх не адмаўляе.

Прыгадаем сабе словы Хрыста, якія Ён сказаў апосталам, калі яны прасілі Яго навучыць іх маліцца: *«Калі ж вы, будучы дрэннымі, умееце даваць добрыя дары дзецям вашым, тым больш Айцец Нябесны дасць Духа Святога тым, хто просіць у Яго»* (Лк 11, 13). А калі вы не прыкладаеце высілкаў, то не здзіўляйцеся, што плён марны. Ваша вольная воля – гэта дар, які Бог не забярэ ніколі. Яна заўсёды застанецца ў Вашых руках.

## ***Тэкст да абмену думкамі***

«Калі пачуеце голас Пана, не рабіце жорсткімі сэрцы вашыя». Сужэнцы, вы не можаце не чуць голас Пана, калі слухаеце, бо Ён гаворыць у вашым доме мільёнам розных спосабаў. Я ёсць: ці чуеце?»

а. Анры Кафарэль

Хрысціянская сужэнская любоў – адначасова чалавечая і Божая – перажываецца ў штодзённых справах. Яна чэрпае сваю сілу ад Бога. Таму добра пакінуць ганарыстыя вяршыні і вярнуцца да канкрэтных дзеянняў, такіх, якія адбываюцца штодзённа. Ці ўсё наша жыццё стаіць пад знакам сужэнскай любові?

Кожнае сужэнства павінна паглядзець на сваё жыццё з розных бакоў: інтымныя моманты, праца, прыемнасці, духоўнае жыццё, дзеці, каб усё гэта паступова з'яднаць у любові. Хоць тэорыя простая, яе прымяненне поўнае сюрпрызаў. Маецца на ўвазе, што паміж сужэнцамі існуе шчыры дыялог. Небяспечным для кожнага з нас з'яўляецца аддавацца марам аб жыцці і аб сваім каханні, замест таго, каб пражываць іх. Гэтая тэма заслугоўвае сур'ёзнага аналізу ўдвух, дзе кожны з вялікай пашанай прыслухаецца да чаканняў свайго сужэнца.

*<u>Наша інтымная сфера</u>*

Гэта наймацнейшы краевугольны камень сужэнскай любові. Ён можа быць таксама крыніцай мноства непаразуменняў і нават даць пачуцце расчаравання. У асноўным з-за таго, што жанчына і мужчына перажываюць па-рознаму сэксуальную любоў. Таму скажам адзін аднаму аб нашых жаданнях. Адкрыем сваё сэрца перад сужэнцам.

Што зрабіць, каб нашыя сэксуальныя стасункі напаўнялі нас шчасцем яшчэ больш: як жонку, так і мужа? Раз гэты ўзаемны дар з'яўляецца асноўным знакам нашай сужэнскай любові, што можна зрабіць, каб ён быў яшчэ больш дасканалы? Гэта не проста асобны акт, які існуе сам для сябе. Ён звязаны з усім нашым сужэнскім жыццём. Ён можа аказацца не да канца шчырым, калі на працягу дня мы не праявілі сваёй любові тысячай іншых спосабаў.

*<u>Наша праца</u>*

Мы працуем, каб забяспечыць побыт свой і сваёй сям'і. Гэта адзін са спосабаў праяўлення нашай любові. Якім чынам дазволіць сужэнцу прымаць удзел у тым, што займае вялікую частку нашага жыцця? Ці тлумачым мы яму (ёй), як выглядае наша праца? Ці распавядаем аб радасцях і смутках, якія яна прыносіць? Ці распавядаем аб людзях, з якімі працуем?

Праца мае таксама яшчэ адно агульнае значэнне. Незалежна ад яе характару яна з'яўляецца ўдзелам у Божай справе стварэння: «напаўняйце зямлю і валодайце ёю». Гэта таксама служэнне для нашых братоў – іншых людзей. Ці ўсведамляем мы гэта

вымярэнне нашай працы? Якія патрабаванні гэта накладае? «Яны будуць кампетэнтна выконваць свае прафесійныя абавязкі» – як кажа **Карта** Суполак Маці Божай. Як мы карыстаемся атрыманымі талентамі? Можам таксама паразважаць, беручы пад увагу гэтыя два аспекты, над карысцю, якую мы прыносім з заробленых грошай. Якім чынам мы ставімся да грошай?

*Нашыя забавы*

Якія гэта забавы? Ці спрыяюць яны асабістаму развіццю кожнага з нас? Ці развіваецца дзякуючы ім наша сужэнскае каханне? Магчыма, у нас розныя густы? Тады з'яўляецца патрэба так арганізаваць гэты час, каб ён быў крыніцай адпачынку для мужа і жонкі (таксама для дзяцей). Гэта справа час ад часу патрабуе аналізу.

*Наша духоўнае жыццё*

Размова аб вашым духоўным жыцці з'яўляецца адным з самых галоўных аспектаў абавязку «Сядзем разам». Паспрабуйце адкрыцца адно аднаму, размаўляючы на гэтую тэму. На якім этапе знаходзіцца ваша вера? На якім этапе знаходзяцца вашыя зносіны з Богам? Якія вашыя духоўныя памкненні? Што мы прымаем як важны выклік Евангелля?

Гэта добры спосаб найперш зазірнуць у самога сябе, каб пасля распавесці ўсё гэта сужонку. Такая размова можа аказацца зусім няпростай. Падумаем разам, што ў дадзены момант з'яўляецца найважнейшым для нас на дарозе святасці? Паразмаўляем аб тым, чым з'яўляецца для нас святасць?

Святасць – гэта шлях. Шлях, падзелены на кавалкі. Кожны наступны адрозніваецца ад папярэдняга, таму высілкі, скіраваныя да святасці, павінны быць прыстасаваныя да бягучага перыяду нашага жыцця.

Дашліце ў пісьмовай форме свае разважанні, якія нарадзіліся ў вас пасля прачытання тэксту да абмену думкамі, пілатуючай пары. Разважанні могуць быць у рознай форме. Да гэтага часу вы часцей за ўсё дасылалі пытанні. Можна так рабіць і далей. Можна аднак пайсці крок наперад. Можна падзяліцца з суполкай вашымі думкамі, якія нарадзіліся пасля прачытання прапанаванага тэксту. Свае разважанні вы можаце скончыць пытаннем, якое працягне размову на сустрэчы.

- ***Абмен думкамі на сустрэчы***

- Падзел часу на прафесійную працу і працу ў хатняй гаспадарцы – ці падпарадкаваны ён будаванню сужэнства і сям'і, ці толькі зараблянню грошай?
- Мы адпачываем разам ці асобна? Што мы можам змяніць, каб гэта быў час будавання нашай любові?
- Якое важнае рашэнне мы прынялі нядаўна альбо прымем у бліжэйшы час адносна нас і нашых дзяцей? Чые патрэбы мы палічылі прыярытэтнымі?

***Харызмат Руху і педагогіка***

«Штодзённая сустрэча мужа і жонкі на сужэнскай малітве (калі гэта магчыма – сямейнай)».

Што такое суполка Маці Божай?

Сэнс і вартасць сужэнскай малітвы тлумачыць айцец Кафарэль у лісце ад сакавіка 1962 года.

**Мініяцюра Касцёла**

…Хрысціянскае сужэнства гэта не толькі ўзаемны дар паміж мужчынам і жанчынай; гэта таксама дар – прысвячэння саюза Хрысту. Хрыстос прысутны ў гэтым саюзе ад моманту, калі, аддаючы наш саюз Богу, мы адкрыліся на Яго; таму святы Ян Хрызастом называе такі саюз «мініяцюрай Касцёла».

Божая прысутнасць становіцца фактам ужо тады, калі двое ці трое сабраныя ў імя Хрыста (Мц 18, 20), але ў выпадку сужэнскай пары – гэта штосьці большае: гэта запавет у біблійным значэнні гэтага слова, паміж Хрыстом і парай. Бог Яхвэ прамовіў аднойчы да Ізраільцян: *«і будзеце Маім народам, і Я буду вашым Богам»*. Хрыстос паўтарае гэтыя словы сужэнцам. Звязаны з імі і прысутны сярод іх, Хрыстос прагне аддаць пашану Свайму Айцу, заступацца разам з сужэнцамі і праз іх за ўвесь свет.

Важным элементам гэтага сужэнскага культу з'яўляецца непасрэдна малітва сужэнцаў. Вечарам, калі мужчына і жанчына моляцца, Нябесны Айцец чуе малітву свайго ўмілаванага Сына, бо ў іх сэрцах пачуцці ажыўляе Хрыстовы Дух. Пакуль чалавек не падымецца на гэты ўзровень, ён не зможа цалкам ані зразумець, ані развіваць сужэнскую малітву. Абавязковасць сужэнскай малітвы і яе важнасць праяўляецца толькі ў перспектыве сужэнскага сакрамэнту. Адным словам, калі Хрыстос яднае ў сакрамэнце сужэнства мужчыну і жанчыну, Ён робіць гэта для заснавання санктуарыя, якім з'яўляецца хрысціянскае сужэнства, дзе Ён зможа аб'яўляцца: аб'яўляецца ў тым саюзе і праз яго; Ён зможа праводзіць вялікі культ сыноўскай пашаны, праслаўлення і заступніцтва, які прынёс свету.

А сямейная малітва? Сужэнская пара вельмі хутка становіцца сям'ёй. Сужэнская малітва тады натуральна ператвараецца ў сямейную малітву. Не кажу, што сямейная малітва замяняе сужэнскую. Асабістая малітва з'яўляецца асноўнай крыніцай духоўнага жыцця кожнага хрысціяніна. Для таго, каб зразумець глыбіню і сэнс сямейнай малітвы, трэба прыйсці да яе з сужэнскай малітвы.

Сужэнцы з'яўляюцца часткай Касцёла, як мы ўжо казалі. Яны жывуць жыццём Касцёла: першай задачай малой часткі, як і ўсяго Касцёла, з'яўляецца праслаўленне Бога. Не забудзем таксама той факт, што сужэнцы маюць і іншыя характэрныя, уласныя заданні, якімі з'яўляюцца: нараджэнне дзяцей і стварэнне асяроддзя любові, якое дае магчымасць сапраўднага чалавечнага развіцця ўсім членам сям'і, асабліва дзецям. Аднак для правільнага разумення нараджэння дзяцей у хрысціянскім сужэнстве мы павінны разглядаць гэтую тэму ў перспектыве місіі праслаўлення.

<u>*Патлумачым гэта*</u>

Першапачатковай мэтай плоднасці ў хрысціянскім саюзе ёсць, а дакладней павінна быць, нараджэнне дзяцей і выхаванне іх як «тых, хто пакланяецца ў духу і праўдзе», каб на зямлі адбывалася шанаванне сапраўднага Бога.

Тым часам, перш, чым дзеці пераймуць эстафету і створаць уласную сям'ю, сужэнская малітва абдымае іх і дзякуючы ім адкрываецца на сямейную малітву, так як жыццядайныя сокі, якія праходзяць праз ствалы, дасягаюць галінаў, каб тыя прывялі іх да лістоты, кветкаў і пладоў. Малітва сужэнцаў абдымае дзяцей, каб спяваць хвалу Богу ад імя ўсяго свету. Менавіта так зразуметая сямейная малітва з'яўляецца чымсьці

іншым, чым проста мілай традыцыяй: гэта сапраўднае галоўнае дзейства, самае важнае, асноўнае заданне хрысціянскай сям'і. Малітва адрознівае хрысціянскую сям'ю ад нехрысціянскай. Таму сямейная малітва не абмяжоўваецца толькі малітвай бацькі ці маці, альбо толькі малітвай бацькоў, ці толькі дзяцей, яна становіцца малітвай усіх разам, адзінагалоснай, у якой ніхто не будзе толькі гледачом, у якой кожны прымае актыўны ўдзел.

*Неабходныя высілкі*

Па-першае, трэба, каб саюз аб'ядноўвала любоў – гэта ясна – гэта значыць, каб мужчына і жанчына былі злучаныя не толькі матэрыяльна, але і духоўна. Каб іх бачнае адзінства было знакам адзінства душаў. *«Каб былі адно»*. На час малітвы няхай спыняцца ўсе адрозненні, няхай супакой паміж імі стане больш дасканалы.

Другі высілак: няхай муж і жонка адновяць сваю веру ў заключаны з Хрыстом саюз, у тое, што Ён прысутны сярод іх. Няхай усвядомяць, што Хрыстос нецерпяліва чакае, каб праз іх, тых, хто аддаў сябе Яго служэнню, скласці пашану Айцу.

Трэці высілак: няхай разам прыслухаюцца да Хрыста. Бо як можна маліцца да Хрыста, у еднасці з Ім, не стараючыся зразумець Яго думкі, пачуцці, інтэнцыі, так, каб узяць іх і занесці Богу? Што значыць прыслухацца да Хрыста? Можна рабіць гэта мноствам розных спосабаў.

Вялікай дапамогай у гэтым з'яўляецца Божае Слова. Вы можаце пачаць малітву ад чытання Святога Пісання, пасля памаўчаць і супольна разважаць над ім. Можаце падзяліцца тым, што вы пачулі ў вашым асабістым слуханні Божага Слова. Варта, каб вы прыгледзеліся да падзеяў, якія адбыліся ў гэты дзень. Пастарайцеся ў спантаннай малітве падзякаваць Богу за ўсе падзеі. Ваша сэрца падкажа вам, што вы хочаце ўголас сказаць Богу. Гаварыце аб вашых цяжкасцях, просячы ў Бога дапамогі. Калі ваша духоўнае развіццё будзе ўзрастаць, вы заўважыце, што магчыма таксама маліцца малітвай перапрашэння, нават такой, у якой вы скіруеце свае прабачэнні да сужэнца. Магчыма напачатку вам будзе прасцей маліцца з дапамогай малітваў сабраных у літургіі касцёла, адмаўляць Ружанец, Каронку да Божай Міласэрнасці, ці іншыя малітвы. Не перажывайце. Пачаць заўсёды складана.

*Цяжкасці*

Супольная малітва можа быць вельмі складанай. Нават у хрысціянскіх сем'ях сустракаюцца непапраўныя індывідуалісты. Адзін муж напісаў: «Я ніколі не адчуваў патрэбы далучыцца да жонкі ў малітве да Бога, ні ў першыя месяцы пасля шлюбу, ні зараз». Думаю, што ў выпадку такіх пар патрэбна патлумачыць глыбокі сэнс сужэнскай малітвы, як мы гэта ўжо і зрабілі. Многія супраціўляюцца гэтай малітве, бо не ведаюць, чым яна сапраўды з'яўляецца. Такім чынам, людзі з пэўным тыпам тэмпераменту сутыкаюцца з большымі цяжкасцямі ў выражэнні сваіх рэлігійных пачуццяў, чым іншыя.

Некаторыя праціўнікі спасылаюцца на рознасць формаў духоўнасці ў сужэнцаў. Паслухайце пару, якая па гэтай прычыне амаль пакінула сужэнскую малітву. «Мой муж, - піша жанчына, - выхоўваўся ў езуітаў, я ў дамініканак. Мы думалі, што з-за гэтага мы не можам дасягнуць сапраўднай духоўнай еднасці». І ведаеце, што з імі здарылася? Дзеці! «Нас прымусілі зноў адкрыць Бога, гэтым разам не Бога дамініканцаў, ці Бога езуітаў, а проста Бога».

Такія духоўныя адрозненні, якія паходзяць з рознага фармацыйнага досведу трэба пераступіць, перамагчы. Перамагчы, аднак, не значыць сцерці. Розныя духоўнасці, калі атрымліваецца пагадзіць іх паміж сабой, могуць стварыць больш багатую гармонію, чым абсалютная ідэнтычнасць духоўнага ўспрыняцця сужэнцаў.

*Станоўчыя вынікі*

Пакінем цяпер цяжкасці і засяродзімся на станоўчых выніках сужэнскай малітвы, аб якіх можна пачуць у многіх сведчаннях.

Было б памылкай, як мы сказалі, лічыць, што сэнс сужэнскай малітвы заключаецца ў першую чаргу ў яе пазітыўных наступствах: хрысціяне моляцца перад усім для таго, каб аддаць пашану Богу. Гэта аднак не перашкаджае нараджэнню многіх каштоўных станоўчых момантаў сужэнскай малітвы. Плёнаў, да якіх не заўсёды можна дакрануцца альбо падлічыць іх.

*Вось некалькі з гэтых “дадатковых цікавостак”*

Адно сужэнства так дзеліцца сваім досведам: «Мы маліліся для праслаўлення Бога, і Бог раптоўна зрабіў нам цудоўны падарунак: прамаўляючы ўголас нашу асабістую малітву, мы адкрылі адзін перад адным таемнікі сваёй душы і самыя схаваныя турботы нашага ўнутранага жыцця». Дастаткова хаця б у мінімальнай ступені маліцца сужэнскай малітвай, каб можна было сказаць, што падчас яе мы адкрываем, часта пасля многіх год сужэнства, душу свайго сужэнца, а таксама турботы і глыбокія прагненні яго ўнутранага жыцця. Мы пазнаем кошт гэтага адкрыцця, калі прызнаем, што сапраўднае глыбокае веданне асобы сужэнца з’яўляецца першай умовай павагі і сапраўднага кахання.

Гаворачы аб гэтым узаемным пазнаванні, адно сужэнства распавяло легенду, у якой двое закаханых, п’ючы з аднаго келіха, даведваюцца думкі адно аднаго. І да гэтага дадалі: «Малітва сужэнцаў – гэта штосьці падобнае. Пасля супольнай малітвы дзве душы ўжо не падаюцца адно аднаму такімі непранікальнымі».

Іншы станоўчы ўплыў блізкі гэтаму першаму: сужэнская малітва - гэта адзін з сур’ёзных фактараў духоўнага адзінства і адзінства паміж сужэнцамі ўвогуле. Адно маладое сужэнства напісала: «Гэта яна сфармавала нашу супольную душу». Шмат старэйшых параў магло б сказаць тое самае, і я асабіста перакананы, што высокая якасць адзінства і інтымнасці паміж сужэнцамі ніколі не будзе дасягнута тымі, хто не практыкуе супольную малітву.

Нельга ствараць адзінства не абмяжоўваючы непаразуменняў: гэта новы пазітыўны плён сужэнскай малітвы. Паслухайце: «Мы павінны былі расстацца на некалькі тыдняў і незадоўга перад ад’ездам пасварыліся. Атмасфера была цяжкая і мы адчувалі, што сапсуём гэты апошні момант з-за сваёй ганарыстасці, якая не дазваляе ніводнаму з нас зрабіць першы крок. Хтосьці з нас, аднак, прапанаваў супольную малітву. Перад Богам трэба было пазбавіцца ад сваёй ганарыстасці і перастаць гуляць у гульню, хто даўжэй вытрымае. Мы папрасілі прабачэння і ў асабістай малітве, якую мы прамаўлялі ўголас, адбыўся паміж намі ў той вечар такі дыялог, настолькі шчыры і моцны, якога мы да гэтага часу не ўяўлялі».

Прашу дадаць да гэтага, што сужэнская малітва з’яўляецца вялікім рухавіком асабістага духоўнага жыцця ў саюзе.

Без сумневаў, з-за сваёй сціпласці, асобы, якія даслалі нам свае сведчанні, замоўчваюць яшчэ адно іншае благаславенне малітвы, якое, аднак, лёгка заўважыць. Я маю на ўвазе духоўную плоднасць. Існуюць сужэнствы цудоўна прамяністыя; іх духоўнае жыццё ўзрушвае людзей вакол і часам яны маюць шчасце сустрэць няверуючага чалавека, які давярае ім сваю прагу лепш пазнаць Хрыста, якога ён у іх бачыць.

Што асабіста да мяне, то я перакананы, што сужэнская малітва ў вялікай меры ўяўляе сабой гэтую духоўную плоднасць саюза.

*Айцец Анры Кафарэль*

На тэму сужэнскай малітвы прыгожа гаворыць айцец Кафарэль у тэксце змешчаным да абмену думкамі. **Сужэнская і сямейная малітва** – гэта канкрэтны пункт высілку. Зараз некалькі словаў на тэму **сямейнай малітвы**.

Зразумела, што мы не можам маліцца сямейнай малітвай, калі ў нас няма дзяцей. Аднак нават тады, калі мы атрымалі дар бацькоўства, здараецца, што ў пэўны момант дзеці больш ці менш выразна паказваюць, што больш ня хочуць з намі маліцца. Звычайна гэта здараецца ў падлеткавым узросце, які супадае з перыядам бунту і частым паніжэннем бацькоўскага аўтарытэту. Гэты час заўсёды складаны для бацькоў. У гэты перыяд іх галоўная задача – даць сваім дзецям бяспеку, каб іх імкненне да самастойнасці, да самавыражэння не стала крыніцай сур'ёзных здарэнняў.

З іншага боку, такі бунт мае вялікую каштоўнасць, бо з'яўляецца праявай вольнай волі, якая выражаецца менавіта такім чынам. Вольная воля з'яўляецца каштоўным дарам, які мы атрымалі, і тут няма гаворкі аб тым, каб яе стрымліваць. Дзеці ў пэўным сэнсе павінны пакінуць веру бацькоў, каб стварыць з Богам свой уласны кантакт. Таму, калі дзеці адмовяцца ад супольнай малітвы, прыміце гэта з паразуменнем. Але не пакідайце спробаў і прапаноўвайце супольную малітву. Магчыма яна будзе мець іншы характар. Вы будзеце маліцца разам пры нагодзе нейкіх важных падзеяў ці святаў.

Памятайце таксама, што вы заўсёды павінны дбаць аб прывабнасці малітвы, аб тым, каб яна пасавала да ўзросту дзяцей. Чытанне доўгіх малітваў, якія паўтараюцца, можа знеахвоціць дзяцей маліцца. Кожны з нас даспявае да малітвы.

Варта, каб вы таксама звярнулі ўвагу, што ад другой сустрэчы мы прасілі вас аб сужэнскай малітве, аб тым, каб маліцца *Магніфікат*. Пасля мы прапанавалі вам, каб вы ў супольнай малітве прамаўлялі інтэнцыі, аб якіх прасілі іншыя сужэнствы. Гэта таксама сужэнская малітва. Ад сёння мы просім, каб вы напоўнілі свае сужэнскія малітвы і, калі гэта магчыма, сямейныя малітвы новымі формамі малітвы. Якімі? Гэта залежыць ад вас. Можаце браць прыклад з супольнай малітвы экіпы. У выпадку сямейнай малітвы вы мусіце дапасоўваць яе да ўзросту і духоўных патрэбаў дзяцей.

### 3. Заданні на час паміж сустрэчамі 

- **Паспрабуйце памаліцца разам з сужэнцам адзін ці два разы на тыдзень. Памятайце аб штодзённай малітве *МАГНІФІКАТ* і інтэцыях суполкі.**

- Сядзьце разам да дыялогу ў прысутнасці Госпада. Карыстаючыся тэкстам аб сямейнай малітве, вы можаце падрыхтаваць тэму для размовы ў прысутнасці Бога. Можаце падзяліцца са сваім сужэнцам досведам сямейнай малітвы ў вашых бацькоўскіх сем’ях. Калі ў вас ёсць дзеці, асабліва маленькія, вы можаце паразмаўляць аб тым, як узбагаціць вашу сямейную малітву. Для дзяцей важна не толькі тое, што яны робяць, але і тое, як гэта адбываецца.
- Не забудзьцеся аб іншых пунктах высілку: абавязку «Сядзем разам», Слове Божым, асабістай малітве і правілах жыцця.
- Разам прачытайце тэкст на наступную сустрэчу. Пасля размовы дашліце свае каментарыі. Паспрабуйце напоўніць вашыя каментарыі разважаннямі.
- Памятайце аб супольнай падрыхтоўцы да дзялення жыццём.
- Дашліце галоўную інтэнцыю адказнай пары. Так вы дапаможаце ім у падрыхтоўцы і правядзенні сустрэчы.